мирование и интернет-технологии WebConf2018 : тез. докл. IV Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 14–18 мая 2018 г. / Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2018. – С. 46–47.

2. *Губайдуллина, Г. Н.* Swot-анализ в системе менеджмента вуза / Г. Н. Губайдуллина // Вестник Российского университетата дружбы народов. Серия: Информатизация образования. – 2011. – № 4. – С. 39–42.

3. *Кошкина, Е. Н.* SWOT-анализ применения дистанционного обучения в России / Е. Н. Кошкина // Вестник Международного института экономики и права. – 2013. – № 4 (13). – С. 27–31.

4. *Кручинин, М. В.* Применение цифровых технологий обучения в высшей школе: проблемы и перспективы, SWOT-анализ / М. В. Кручинин, Г. А. Кручинина, Л. А. Петрукович // Казанский педагогический журнал. – 2020. – № 3. – С. 64–74.

5. *Овинова, Л. Н.* SWOT-анализ процесса воспитания в цифровой образовательной среде вуза / Л. Н. Овинова, Е. Г. Шрайбер // Педагогика. Вопросы теории и практики. – 2021. – Т. 6, № 4. – С. 700–707.

6. *Торобеков, Б.* SWOT-анализ в формировании стратегии развития вузов / Б. Торбеков, Г. Белекова // Alatoo Academic Studies. – 2016. – № 1. – С. 231–241.

7. *Morrison, M.* SWOT Analysis for Education, Schools, Colleges and Universities / M. Morrison. – URL: clck.ru/37iNRF (date of access: 13.01.2024).

*8.* SWOT Analysis of the Educational Processes / Central Research Institute (Bucharest, Romania). – URL: clck.ru/37iNTk (date of access: 13.01.2024).

УДК 378.147:[378.016:069(091)]

***І. Н. Колабава,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

# ПРАБЛЕМАТЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН СТУДЭНТАМ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ «МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ»

**Анатацыя**. Разглядаюцца пытанні выкладання спецыяльных гістарычных дысцыплін, якія займаюць значнае месца ў працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны па курсе «Спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны». Вучэбныя дысцыпліны курса, такія як «Нумізматыка», «Геральдыка», «Фалерыстыка»,

«Метралогія», «Храналогія», «Сфрагістыка», «Анамастыка», выконваюць у навучальным працэсе інфармацыйна-пазнавальную, даведачную, матывацыйную, самаадукацыйную і іншыя функцыі, у ходзе выкладання якіх набывае значнасць выкарыстанне кампаратыўнага, нагляднага, праблемнага і некаторых іншых метадаў, якія ствараюць магчымасць паўнавартаснага разумення тэарэтычнага матэрыялу.

**Ключавыя словы**: спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны, мэты, задачы, методыка выкладання курса «Нумізматыка».

***I. Kolabava,***
*PhD in History, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts"*

## PROBLEMS OF TEACHING SPECIAL HISTORICAL DISCIPLINES TO STUDENTS OF THE SPECIALTY "MUSEUM WORK AND PROTECTION OF HISTORICAL AND CULTURAL HERITAGE"

**Abstract.** The article examines the issues of teaching special historical disciplines that occupy a significant place in the process of training specialists in the field of museum affairs and protection of historical and cultural heritage in the course "Special Historical Disciplines". The academic disciplines of the course, such as "Numismatics", "Heraldry", "Phaleristics", "Metrology", "Chronology", "Sphragistics", "Anomastics", perform informational, cognitive, reference, motivational, self-educational and other functions in the educational process, during the teaching of which it is important to use comparative, visual, problematic and some other methods that create the possibility of complete assimilation of theoretical material.

**Keywords:** special historical disciplines, goals, objectives, teaching methods of the course "Numismatics".

Вучэбная праграма спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» уключае выкладанне студэнтам шэрага спецыяльных гістарычных дысцыплін.

Курс «Спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны», які аб'ядноўвае шырокае кола (без адгалінаванняў – некалькі дзясяткаў) інфармацыйна ёмістых асобных вучэбных дысцыплін, што даследуюць і інтэрпрэтуюць разнастайныя гістарычныя крыніцы, займае значнае месца ў агульнай сістэме гістарычных ведаў. Значнасць кожнай з іх заключаецца ў тым, што, аналізуючы ўнутраныя і знешнія асаблівасці адпаведных крыніц,

у выніку яны пашыраюць інфармацыйнае поле працэсу даследавання гістарычнага развіцця чалавецтва.

Мэтай вывучэння прадстаўленага курса з’яўляецца авалоданне студэнтамі асновамі тэарэтычнай і практычнай базы выкладаемых спецыяльных гістарычных вучэбных дысцыплін. Вырашэнне пастаўленых у сувязі з гэтым задач павінна прывесці да фарміравання ў студэнтаў не толькі тэарэтычных ведаў, але і неабходных уменняў і навыкаў для далейшай практычнай дзейнасці. У фондах многіх музеяў краіны захоўваюцца нумізматычныя, фалерыстычныя, сфрагістычныя, геральдычныя і іншыя калекцыі, якія патрабуюць ад супрацоўнікаў прафесійнага падыходу да іх вывучэння, дэманстравання і захавання.

Непасрэдная сувязь з штодзённым жыццём чалавека вызначае актуальнасць спецыяльных гістарычных вучэбных дысцыплін у справе даследавання гісторыі грамадства, а таксама спрыяе зацікаўленасці ў засваенні неабходнай інфармацыі з боку студэнцкай аўдыторыі. Выкарыстанне набытых ведаў не толькі ў будучай прафесійнай дзейнасці, але і, што можа больш значна, у практыцы ўласнага жыцця, прыводзіць да адносна лёгкага засваення ўзгаданага вучэбнага курса.

Студэнтам спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» ў межах курса «Спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны» чытаюцца такія вучэбныя дысцыпліны, як «Нумізматыка», «Геральдыка», «Фалерыстыка», «Метралогія», «Храналогія», «Сфрагістыка», «Анамастыка».

Названыя вучэбныя дысцыпліны выконваюць у навучальным працэсе інфармацыйна-пазнавальную, даведачную, матывацыйную, самаадукацыйную, самакантралюючую і, зразумела, выхаваўчую функцыі. У ходзе іх выкладання асобую значнасць набывае выкарыстанне кампаратыўнага, нагляднага, праблемнага і некаторых іншых метадаў, якія ствараюць магчымасць паўнавартаснага разумення тэарэтычнага матэрыялу.

Засваенне курса «Спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны» забяспечвае фарміраванне акадэмічных, сацыяльна-асабістых і прафесійных кампетэнцый. Студэнты павінны авалодаць асновамі даследчай дзейнасці; здзяйсняць пошук, аналіз і сінтэз інфармацыі; быць здольнымі да самаразвіцця і ўдасканалення ў прафесійнай дзейнасці; выкарыстоўваць тэарэтычныя і метадалагічныя асновы гісторыка-культурных і музеялагічных ведаў

у дзейнасці сучаснага музея і даследаванняў аб'ектаў культурнай спадчыны; выкарыстоўваць метады і дасягненні спецыяльных гістарычных дысцыплін для выяўлення, крытычнага аналізу і інтэрпрэтацыі музейных крыніц.

Выкладанне спецыяльных гістарычных вучэбных дысцыплін патрабуе ад выкладчыка выпрацоўкі агульнай канцэпцыі, лагічнай пабудовы структуры і зместу лекцыйнага матэрыялу, выкарыстання міжпрадметных сувязей, стварэння грунтоўнай вучэбна-метадычнай базы, а таксама і знаёмства з найноўшымі дасягненнямі ў акрэсленай галіне ведаў.

Пры вывучэнні дысцыплін пазначанага курса выкарыстоўваюцца сучасныя метады навучання, у тым ліку і камп'ютарныя тэхналогіі. Асноўнымі формамі навучання з'яўляюцца лекцыі і семінарскія заняткі, заданні для самастойнай работы студэнтаў. Завяршальныя формы кантролю ведаў – залікі і экзамены.

Для прыкладу выкарыстання разнастайных падыходаў пры выкладанні вучэбных дысцыплін курса можна звярнуцца да вопыту правядзення лекцый і семінарскіх заняткаў па такой вучэбнай дысцыпліне, як «Нумізматыка». Па вучэбнай праграме на пазначаную дысцыпліну прадугледжаны 24 лекцыйныя і 16 семінарскіх гадзін. Лекцыйныя і семінарскія заняткі забяспечаны шырокім спектрам асноўнай і дадатковай літаратуры [1; 3; 4; 5]. Студэнтам таксама прапануецца вучэбна-метадычны комплекс «Нумізматыка», у якім у канцэнтраваным выглядзе даецца агляд гісторыі грашовага абарачэння на беларускіх землях [2].

Лекцыйны курс складаецца з тэарэтычнага і практычнага раздзелаў. У першым – разглядаюцца пытанні гістарыяграфіі, функцый грошай, уласцівасцей манеты, тэхнікі манетнай вытворчасці, ролі манетных скарбаў, а ў другім – перыяды гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі з канца I ст. да пачатку XXI ст.

Для сістэматызацыі і вызначэння ўзроўню набытых тэарэтычных ведаў на працягу лекцыі перад студэнтамі ставяцца пытанні, якія звязваюць пройдзены і новы матэрыял у адзінае цэлае. Па кожнай з вызначаных тэм створаны адпаведныя прэзентацыі, якія знаёмяць студэнтаў з асноўнымі палажэннямі выкладаемага курса. Трывалае засваенне ведаў аб нумізматыцы патрабуе, у першую чаргу, стараннага вывучэння лекцыйнага і адпаведнага ілюстрацыйнага матэрыялу.

Значная ўвага ў навучальным працэсе надаецца семінарскім заняткам, на якіх студэнты выступаюць з паведамленнямі і ўласнымі прэзентацыямі па прапанаванай тэматыцы. Для больш дасканалага асвятлення асобных пытанняў студэнтам пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў прапануецца знаёмства з дадатковай літаратурай. Абавязковай часткай семінарскіх заняткаў з’яўляецца правядзенне франтальнага апытання ўсёй групы па разглядаемай тэме. Больш трываламу засваенню вучэбнага маэрыялу спрыяе калектыўнае абмеркаванне адказаў на пытанні адпаведнай часткі спецыяльнай нумізматычнай віктарыны і тэставага матэрыялу. На семінарскіх занятках пры разглядзе тэм па тэхніцы манетнай вытворчасці і гісторыі фальшываманетніцтва магчымы паказ фрагментаў дакументальных фільмаў.

Разнастайнасць у выкладаемы матэрыял уносіць выкарыстанне на лекцыйных і семінарскіх занятках фальклорных матэрыялаў на грашовую тэматыку (прыказак, прымавак, сюжэтаў легенд і паданняў і інш.), сабраных па этнаграфічных работах даследчыкаў XIX – пачатку XX ст. Практычную значнасць для студэнтаў мае дэманстраванне табліц коштаў на харчовыя, нехарчовыя тавары і паслугі ў адпаведныя перыяды гісторыі грашовага абарачэння, складзеныя на падставе архіўных дакументаў. Асобную цікавасць студэнцкай аўдыторыі выклікае магчымасць на занятках трымаць у руках аўтэнтычныя манеты, якія бытавалі ў грашовым абарачэнні на беларускіх землях.

Самастойная работа студэнтаў уключае не толькі падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў, але і вывучэнне знешняга выгляду манет, якія былі ў выкарыстанні насельніцтва беларускіх зямель. На пачатку выкладання курса кожны студэнт атрымлівае для вывучэння электронны варыянт табліцы з узорамі адпаведных грашовых сродкаў. Праверка візуальнага ведання складу манетнага фонду ў гісторыі краіны з’яўляецца абавязковым элементам адказу на экзамене.

Тэарэтычныя веды аб прыёмах экспанавання і навуковай апрацоўкі нумізматычных калекцый замацоўваюцца студэнтамі пры наведванні экспазіцый Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Нумізматычнага кабінета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Музея грошай Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Агляд нумізматычных экспазіцый стварае

магчымасць правядзення кампаратыўнага (параўнальнага) аналізу шматвектарных падыходаў розных музеяў да паказу гісторыі грашовага абарачэння на беларускіх землях.

Аналагічныя патрабаванні да студэнтаў і забяспечанасць нагляднымі матэрыяламі пры правядзенні лекцыйных і семінарскіх заняткаў, напрамкі самастойнай работы існуюць і ў дачыненні да астатніх вучэбных дысцыплін узгаданага курса.

Падводзячы вынікі, трэба падкрэсліць значную ролю курса «Спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны» ў падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

*1.* Вспомогательные исторические дисциплины : учебник / Г. А. Леонтьева, П. А. Шорин, В. Б. Кобрин ; под ред. Г. А. Леонтьевой. – 2-е изд., испр. и доп. – М., 2015. – С. 179–214. – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book_red&id=429883 (дата обращения: 10.01.2024).

*2. Колабава, І. Н.* Нумізматыка : вучэб.-метад. комплекс / І. Н. Колабава. – Мінск, 2018. – С. 7–118.

*3. Колабава, І. Н.* Нумізматыка : дапаможнік / І. Н. Колабава. – Мінск, 2024. – С. 6–158.

*4. Рябцевич, В. Н.* Нумизматика Беларуси / В. Н. Рябцевич. – Минск, 1995. – С. 3–102.

*5.* Специальные исторические дисциплины : учеб. пособие / М. М. Кром [и др.] ; сост. М. М. Кром. – 2-е изд., испр. – СПб., 2003. – С. 162–202, 248–368, 398–456, 472–513.

УДК 37.026.7-057.875:[793.31:378.147]

***И. В. Ковальчик,***
*кандидат искусствоведения, доцент,*
*доцент кафедры хореографии учреждения образования*
*«Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

## СПЕЦИФИКА ОРГАНИЗАЦИИ САМОСТОЯТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ СТУДЕНТОВ МОДУЛЯ «ИСКУССТВО БАЛЕТМЕЙСТЕРА» (направления специализации «Народный танец»)

**Аннотация.** Рассматривается проблематика организации управляемой самостоятельной работы студентов по дисциплине «Искусство балетмейстера» в связи с изменением ранее выстроенной логической системы преподавания для студентов направления специализации «Народный танец». Проанализированы трансформационные процессы